# ЗАКЛЮЧЭННЕ

савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” па дысертацыі НЕНАДАЎЦА Ягора Аляксеевіча “Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць”

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.** Дысертацыя Я. А. Ненадаўца адпавядае спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка і галіне – філалагічныя навукі.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.** У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай фалькларыстыцы праведзена комплекснае вывучэнне воднай прасторы ў гарманічнай спалучанасці гнасеалагічнага і аксіялагічнага аспектаў даследавання. Тэарэтычна асэнсаваны і прааналізаваны розныя фальклорныя жанры (абрад выклікання дажджу, асобныя з’явы сямейнай абраднасці, замовы, рытуальна-магічныя, казачныя тэксты, малыя фальклорныя жанры, віды пазаабрадавай паэзіі), што дазволіла глыбока раскрыць змест, вызначыць семантыку, сімволіку і функцыянальнасць водных сімвалаў, абумоўленых жанравай спецыфікай, выявіць непасрэдную сувязь вербальнага, акцыянальнага і прадметна-атрыбутыўнага кодаў, адзначыць устойлівасць бытавання водных сімвалаў і высветліць асноўныя тэндэнцыі эвалюцыі і трансфармацыі, звязаныя з сімвалізацыяй вады ў беларускім фальклоры.

**Фармуліроўка канкрэтных навуковых вынікаў, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень.** У адпаведнасці з пп. 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў па выніках дысертацыйнага даследавання “Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць” Ненадаўцу Ягору Аляксеевічу прысудзіць вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка за:

- комплекснае даследаванне воднай прасторы як аксіялагічна-сэнсавай канстанты беларускага фальклору ў арганічнай повязі атрыбутыкі (якасная, лічбавая, колеравая, прадметная, прыродна-ландшафтная і інш.) і прэдыкатыўнасці з семантыкай актыўнага дзеяння ці знешняга ўздзеяння;
- за раскрыццё семантыкі, сімволікі і функцыянальнасці воднай прасторы ў вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, што абумоўлена спецыфікай жанравай прыналежнасці з выяўленнем адметных міфапаэтычных асаблівасцей мастацкага ўвасаблення вобраза вады ў многіх фальклорных жанрах;
- аналіз воднай прасторы як цэласнай, шматпланавай сістэмы паэтычных і невербальных сімвалаў, што з’яўляюцца важным сродкам традыцыйнага мадэлявання свету; выяўленне тыпалогіі аксіялагічных складнікаў канцэпту “вада” ў іх сінкрэтычным адзінстве з улікам паходжання, станаўлення і развіцця;
- вызначэнне семантыкі водных сімвалаў у суаднесенасці з ўяўленнямі пра племя-род, працяг роду, сям’ю, лёс, шчасце, дабрабыт, магічную далучанасць чалавека да свайго свету і іншасвету; высвятленне спецыфікі функцыянавання вады (у “сакральна” і “прафанна” арыентаваных версіях міфалагічнага вобраза), што выяўляецца ў цесна звязаных, узаемадапаўняльных канцэптах нараджэння-тварэння, смерці-дэструкцыі і абнаўлення-адраджэння.
- увядзенне ў навуковы ўжытак фальклорных матэрыялаў, сабраных дысертантам на працягу 2004-2023 гг.

**Рэкамендацыі па выкарыстанню вынікаў даследавання.** Вынікі і матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца на кафедры беларускай і рускай мовы ў лекцыйным курсе “Беларуская мова. Прафесійная лексіка” і “Беларуская мова і культура маўлення” установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», пры правядзенні вучэбных заняткаў у ДУ “Цэнтралізаваная сістэма публічных бібліятэк г.Мінска”. Бібліятэка-філіял №2 імя Н.К. Крупскай”. Фактычны матэрыял і навуковыя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац па фалькларыстыцы; распрацоўцы лекцыйных курсаў і праграм для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць запатрабаваны ў педагагічнай дзейнасці пры падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне фалькларыстыкі, культуралогіі, этнаграфіі.

Старшыня савета па абароне дысертацый Г.І. Каспяровіч

Сакратар савета па абароне дысертацый Г.І. Цяпкова